# Культура як адказ на палітычны тупік у Беларусі

*Аўтарства: Ірэна Кацяловіч, адказная за кірунак культуры ў Прадстаўніцтве ў нацыянальным адраджэнні Аб'яднанага пераходнага кабінета Беларусі*

*Жнівень 2026*

## Рэзюмэ

У актуальных варунках дзейнасць беларускіх культурніцкіх дзеячоў і арганізацый няздольная развіваць культуру як сектар, а можа толькі змяншаць шкоду, якая наносіцца палітыкай рэжыма Лукашэнкі і метадычнамі спробамі Расеі пашырыць культурны і ідэалагічны ўплыў на Беларусь. Разам з гэтым беларуская культура з'яўляецца складнікам нацыянальнай бяспекі і захавальнікам нацыянальных і дэмакратычных каштоўнасцяў, а разам з адукацыяй і медыя застаецца адным з ключавых інструментаў, што дазваляе заставацца праактыўнымі і ўплываць на будучыню Беларусі ў часе палітычнага тупіка.

Умовы, у якіх свабоднае мастацкае выказванне немагчымае ў Беларусі, а культурніцкія дзеячы за мяжой пазбаўленыя доступу да значнай часткі нацыянальнай інфраструктуры (дакументалісты не могуць здымаць фільмы ў Беларусі, даследнікі не могуць карыстацца большасцю архіваў, спецыялісты не маюць магчымасці ўплываць на стратэгічныя рашэнні ў справе беларускай культурніцкай спадчыны), у тым ліку да фінансавых рэсурсаў сваёй краіны, вымагаюць крэатыўных, нестандартных рашэнняў з боку аўтараў, арганізацый, а таксама стратэгічных партнёраў.

А патэнцыял культуры ва ўмовах абмежаваных інструментаў і недахоп рэсурсаў і няздольнасць у поўнай меры замяніць страчанае дзяржаўнае падтрыманне вымагаюць больш стратэгічных, скаардынаваных і прыярытэтызаваных дзеянняў. У сувязі з гэтым прапануецца перайсці ад палітыкі, арыентаванай на абстрактнае захаванне беларускай культуры, да стратэгіі яе сістэмнага ўзмацнення на ўзроўні Еўрапейскага Саюза, краін-партнёраў і міжнародных арганізацый, у тым ліку UNESCO. Такая стратэгія павінна разглядаць беларускую культуру не толькі як аб'ект падтрымкі, але і як інструмент умацавання дэмакратычнай устойлівасці і еўрапейскай геапалітычнай стабільнасці.

## Апісанне праблемы

Беларуская культура з'яўляецца адной з галоўных арэнаў барацьбы для ўладаў у Беларусі і Расеі за фарміраванне свядомасці беларускага грамадства, нацыянальнай ідэнтычнасці і бачання мінулага і будучыні краіны. Варта адзначыць, што за гады сваёй незалежнасці Беларусь як дзяржава так і не надала належнай увагі нацыянальнай культуры, а выкарыстанне яе як інструмента ўплыву з боку рэжыма Лукашэнкі і Расеі нельга назваць новай з'явай. Аднак пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і звязаных з імі падзеяў, калі беларускі рэжым разгарнуў сістэмныя рэпрэсіі супраць незалежнай культуры, а Расея атрымала магчымасць заўважна пашырыць сваю дзейнасць на

тэрыторыі Беларусі, становішча культуры істотна пагоршылася, а сама яна канчаткова ператварылася ў адзін з цэнтральных інструментаў палітычнага, ідэалагічнага і геапалітычнага супрацьстаяння.

*«Урад з 1994 года праводзіць паслядоўную палітыку русіфікацыі,* – кажацца ў Дакладзе Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы «Процідзеянне размыванню культурнай ідэнтычнасці ў вайне і міры», – *Якая пасля масавых мірных пратэстаў 2020 года супраць спрэчных вынікаў прэзідэнцкіх выбараў набыла выразна карны характар у дачыненні да носьбітаў беларускай мовы і прадстаўнікоў беларускай культуры»*[1].

Міжнародная экспертная ініцыятыва iSANS рэгулярна сведчыць пра тое, што *«беларуская нацыянальная культура ўсё больш прывязваецца да расейскай»*[2]. Яе эксперты адзначаюць, што русіфікацыя ў Беларусі заўважна актывізавалася пасля падзеяў 2020 года, але пасля пачатку поўнамаштабнай вайны Расеі супраць Украіны стала сапраўды сістэмнай: тады кіраўніком прадстаўніцтва Расcупрацоўніцтва ў Беларусі стаў Юрый Макушын, пры ім у Горадні адкрыўся пяты ў краіне Рускі дом, а Рускі дом у Менску атрымаў новы будынак з большымі магчымасцямі[3].

У сваіх аналітычных дакладах iSANS алярмуе, што апошнія тэндэнцыі *«могуць мець для Беларусі сур'ёзныя наступствы, паколькі яны накіраваныя на страту яе самабытнасці, на стварэнне ўмоваў для далейшай інтэграцыі з Расеяй. А пры адначаснай экспансіі расейскай культуры – і на знікненне ў ёй»*[4].

Акурат перафарматаванне беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці з'яўляецца, магчыма, найбольш сур'ёзнай доўгатэрміновай пагрозай для Беларусі. Дзяржава можа страціць незалежнасць і аднавіць яе, але нацыя, якая страціла ўласную культурную ідэнтычнасць і была асіміляваная, рызыкуе страціць здольнасць да такога аднаўлення.

Гэтая пагроза набывае асабліва сур'ёзнае значэнне ў кантэксце доўгатэрміновых мэтаў Расеі ў дачыненні да Беларусі. Паводле ацэнкі Інстытута вывучэння вайны (Institute for the Study of War, ISW)[5], Крэмль рэалізуе стратэгію паступовага паглыблення кантролю над Беларуссю, якая ў перспектыве можа прывесці да яе фактычнай анэксіі – пры захаванні цяперашніх тэндэнцый, як сведчыць справаздача, гэта можа адбыцца на працягу дзесяцігоддзя.

---

[1] Parliamentary Assembly of the Council of Europe (PACE), *Countering the Erasure of Cultural Identity in War and Peace*, Report Doc. 16003, Committee on Culture, Science, Education and Media, rapporteur Yevheniia Kravchuk, 10 June 2024. https://pace.coe.int/en/files/33579/html

[2] Інстытут стратэгічных даследаванняў і аналізу (ISANS). *Ідэнтычнасць: Беларусь і беларусы ў кантэксце сучасных выклікаў*. Аналітычны даклад. Люты 2025. https://isans.org/wp-content/uploads/2025/03/identychnascz-lyuty-2025.docx.pdf

[3] Deutsche Welle. «Беларуская культура не зможа гэтаму супрацьстаяць. Як краіну паглынае «рускі свет»». 10 красавіка 2025. https://www.dw.com/ru/belorusskaa-kultura-ne-smozet-etomu-protivostoat-kak-stranu-poglosaet-russkij-mir/a-72199893

[4] Інстытут стратэгічных даследаванняў і аналізу (ISANS). «Ідэнтычнасць: Беларусь і беларусы ў кантэксце сучасных выклікаў». Сакавік 2025. https://isans.org/wp-content/uploads/2025/04/identychnascz-sakavik-2025.docx.pdf

[5] Institute for the Study of War (ISW). «Russia's Quiet Conquest: Belarus.» January 2025. https://understandingwar.org/research/russia-ukraine/russias-quiet-conquest-belarus/

У гэтых умовах дзеянні Расеі ў сферы культуры, адукацыі і медыя набываюць не толькі гуманітарнае, але і стратэгічнае значэнне. Яны становяцца часткай паслядоўнай дзяржаўнай палітыкі, скіраванай на фарміраванне нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў, пераасэнсаванне іх гістарычнай памяці і замацаванне Беларусі ў расейскай культурніцкай, інфармацыйнай і каштоўнаснай прасторы. У доўгатэрміновай перспектыве такая палітыка стварае перадумовы для ўзнікнення грамадства, больш адкрытага да палітычнай, ваеннай і цывілізацыйнай інтэграцыі з Расеяй і менш схільнага ўспрымаць беларускую дзяржаўнасць як каштоўнасць.

Маштабныя рэпрэсіі і ціск на беларускіх культурніцкіх дзеячоў і арганізацыі з боку рэжыму Лукашэнкі ў гэтым кантэксце з'яўляюцца праблемай не толькі самі па сабе. Яны таксама ствараюць спрыяльныя ўмовы для пашырэння расейскага культурніцкага і ідэалагічнага ўплыву: расейскія культурніцкія прадукты атрымліваюць у сваё распараджэнне публічную прастору, якая праз актыўную зачыстку вызваляецца ад беларускай культуры.

Паводле самага свежага штогадовага «Маніторынга парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры» ад Беларускага ПЭНа[6], *«усяго ў 2025 годзе зафіксавана 1435 парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры»*, і гэта пры тым, што інфармацыя з Беларусі даходзіць усё цяжэй, а дзейнасць сілавых структураў і судоў з часам становіцца ўсё менш празрыстай.

Часцей за ўсё гаворка вядзецца пра *«права на справядлівы суд і факты крымінальнага пераследу; у дачыненні да арганізацый і супольнасцяў сферы культуры – цэнзуру і стварэнне адміністрацыйных перашкод для дзейнасці, у тым ліку прымусовую ліквідацыю»*.

У сваю чаргу ў 2024 годзе было зафіксавана не менш за 1348 парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры[7], у 2023-м – 1499[8], у 2022 годзе – 1390[9], у 2021 – 1455[10], у 2020-м – 593[11].

---

[6] Беларускі ПЭН. «Маніторынг парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры. Беларусь, 2025». Люты 2026. https://penbelarus.org/2026/02/13/manitoryng-parushennyau-kulturnyh-pravou-i-pravou-chalaveka-u-dachynenni-da-dzeyachau-kultury-belarus-2025-god.html

[7] Беларускі ПЭН. «Маніторынг парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры. Беларусь, 2024». Люты 2025. https://penbelarus.org/en/2025/02/20/manitoryng-parushennyau-kulturnyh-pravou-i-pravou-chalaveka-u-dachynenni-da-dzeyachau-kultury-belarus-2024-god.html

[8] Беларускі ПЭН. «Маніторынг парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры. Беларусь, 2023 год». Сакавік 2024. Беларускі ПЭН — Маніторынг парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры. Беларусь, 2023 год

[9] Беларускі ПЭН. «Маніторынг парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры. Беларусь, 2022 год». 2023. Беларускі ПЭН — Маніторынг парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры. Беларусь, 2022 год

[10] Беларускі ПЭН. «Маніторынг парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры. Беларусь, 2021 год». 2022. Беларускі ПЭН — Маніторынг парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры. Беларусь, 2021 год

[11] Беларускі ПЭН. «Без права на культуру. Беларусь 2020». Публічная справаздача паводле маніторынгу парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры. Студзень 2021. Беларускі ПЭН — «Без права на культуру. Беларусь 2020»

Гэтыя дадзеныя сведчаць, што рэпрэсіі ў тым ліку ў дачыненні да беларускай культуры не носяць часовы або рэактыўны характар, звязаны выключна з падзеямі 2020 года. Нягледзячы на тое, што з моманту прэзідэнцкіх выбараў прайшло ўжо некалькі гадоў, маштаб парушэнняў застаецца стабільна высокім, а пераслед незалежнай беларускай культуры такім чынам з'яўляецца доўгатэрміновай дзяржаўнай палітыкай, накіраванай на сістэмнае звужэнне беларускай культурніцкай прасторы і абмежаванне ўплыву беларускай культуры на грамадства.

Пры гэтым Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі Беларусі[12], прынятая ў 2024 годзе, сярод першых у ліку стратэгічных нацыянальных інтарэсаў называе «всемерную защиту народа Беларуси как уникальной исторической общности и единственного источника государственной власти» ды «сохранение самобытности, укрепление духовно-нравственных ценностей белорусского народа, развитие современного культурного пространства страны, защиту исторической памяти».

Такім чынам, беларускія дзяржаўныя дакументы прызнаюць стратэгічнае значэнне культуры для нацыянальнай бяспекі і кіруюцца гэтай перспектывай. Аднак замест палітыкі ўмацавання нацыянальнай культурніцкай прасторы на практыцы рэалізуецца палітыка, якая аслабляе яе, адначасова ўзмацняючы расейскую. Гэта сведчыць пра разыходжанне паміж дэклараванымі нацыянальнымі інтарэсамі і рэальнай – часткова вымушанай у сітуацыі татальнай залежнасці ад Расеі – дзяржаўнай палітыкай.

Зноў жа Беларускі ПЭН фіксуе працэсы *«русіфікацыі культурніцкага поля: замяшчэнне беларускамоўных спектакляў рускамоўнымі, кадравыя перастаноўкі, пры якіх на пазіцыі беларускіх спецыялістаў прыходзяць прадстаўнікі Расеі, а таксама перадача стварэння помнікаў і манументальных аб'ектаў расейскім мастакам і арганізацыям. Гэтыя тэндэнцыі закранулі і літаратурную сферу – у праўладны Саюз пісьменнікаў Беларусі прымаліся асобы, не звязаныя з беларускай літаратурай і культурай»*[13].

Такім чынам, у беларускай культурніцкай прасторы сёння адбываецца барацьба за калектыўную памяць, нацыянальную ідэнтычнасць і бачанне будучыні Беларусі. У гэтым кантэксце варта аглядацца на дзеянні Расеі ў іншых краінах як на прыклад таго, як гэтая дзейнасць можа выглядаць пры эскалацыі. *«Культурнае ачышчэнне ўсё часцей выкарыстоўваецца як зброя вайны з мэтай адмаўлення існавання іншай культурнай ідэнтычнасці і знішчэння яе гістарычных каранёў, каштоўнасцяў, культурнай спадчыны, літаратуры, традыцый і мовы»*[14], – кажа ўжо згаданы тут даклад ПАРЕ ў кантэксце вайны Расеі супраць Украіны. Адначасова паводле Інстытута

[12] Усебеларускі народны сход. «Аб зацвярджэнні Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь». Рашэнне № 5 ад 25 красавіка 2024 г. Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь. https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=P924v0005

[13] Беларускі ПЭН. «Маніторынг парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры. Беларусь, 2025». Люты 2026. https://penbelarus.org/2026/02/13/manitoryng-parushennyau-kulturnyh-pravou-i-pravou-chalaveka-u-dachynenni-da-dzeyachau-kultury-belarus-2025-god.html

[14] Parliamentary Assembly of the Council of Europe (PACE), Countering the Erasure of Cultural Identity in War and Peace, Report Doc. 16003, Committee on Culture, Science, Education and Media, rapporteur Yevheniia Kravchuk, 10 June 2024. https://pace.coe.int/en/files/33579/html

даследвання вайны *«спробы Расеі фактычна анэксаваць Беларусь ажыццяўляюцца праз скаардынаванае выкарыстанне ўсіх асноўных механізмаў дзяржаўнай палітыкі»*[15].

У гэтай сітуацыі падтрымка незалежнай беларускай культуры павінна разглядацца не толькі як салідарнасць з рэпрэсаваным сектарам, але і як стратэгічная інвестыцыя ў будучыню Беларусі, бо яна застаецца адным з нешматлікіх інструментаў, якія дазваляюць захоўваць уплыў на фарміраванне нацыянальнай памяці і прапаноўваць альтэрнатыўнае бачанне будучыні краіны. Гэта адна з нешматлікіх сфер, у якіх дэмакратычныя сілы і іх міжнародныя партнёры ўсё яшчэ здольныя дзейнічаць праактыўна, а не выключна рэагаваць на дзеянні аўтарытарных рэжымаў.

Варта адзначыць, што ў актуальных варунках беларуская культура з'яўляецца яшчэ больш уразлівай праз сістэмныя праблемы і лакуны, назапашаныя за дзесяцігоддзі незалежнасці: гэта слабая інтэграцыя ў агульнаеўрапейскую культурніцкую прастору, недастатковы досвед супрацоўніцтва з еўрапейскімі інстытуцыямі і ўдзелу ў міжнародных праграмах і прафесійных сетках, неразвітая культурніцкая інфраструктура, слабая інстытуцыянальная ўстойлівасць, фрагментаванасць культурніцкага сектара, недастатковая міжнародная бачнасць беларускай культуры, слабая распаўсюджанасць беларускай мовы, а таксама неапрацаванасць і недастатковая даследаванасць значнай часткі нацыянальнай культурнай і гістарычнай спадчыны.

Гэта абмяжоўвае магчымасць эфектыўна рэагаваць на наратыўныя і культурніцкія стратэгіі, якія прасоўвае Расея ў дачыненні да Беларусі, бо культурніцкі сектар вымушаны дзейнічаць ва ўмовах унутранай інстытуцыянальнай слабасці і дадатковых выклікаў, звязаных з эміграцыяй.

Менавіта таму падыход да беларускай культуры павінен грунтавацца на выразнай структуры і доўгатэрміновай стратэгіі, якія адказваюць на назапашаныя праблемы і ствараюць умовы не толькі для яе эфектыўнага функцыянавання сёння, але і для фармавання ўстойлівай культурніцкай сістэмы ў будучыні.

## Аналіз бягучай сітуацыі

Рэкамендацыі, выпрацаваныя падчас канферэнцыі «Люксембургскія рашэнні», уключаюць у сябе асобны раздзел аб захаванні і папулярызацыі беларускай культурнай ідэнтычнасці[16]. Гэтая канферэнцыя адбылася ў чэрвені 2024 года пры супрацы з Палатай дэпутатаў Вялікага Герцагства Люксембург з удзелам прадстаўнікоў еўрапейскіх інстытуцый, нацыянальных парламентаў, міжнародных арганізацый і беларускай грамадзянскай супольнасці, у тым ліку прэзідэнта ПАРЕ Тэадораса Русопуласа і лідаркі беларускіх дэмакратычных сіл Святланы Ціханоўскай. Выніковы дакумент прадстаўляе канкрэтныя дзеянні для арыентацыі і дапамогі ў каардынацыі наступных крокаў.

У якасці адказу на выклікі «Люксембургскія рашэнні» прапануюць перайсці ад падтрымкі асобных

---

[15] Інстытут стратэгічных даследаванняў і аналізу (ISANS). «Ідэнтычнасць: Беларусь і беларусы ў кантэксце сучасных выклікаў». Сакавік 2025.
https://isans.org/wp-content/uploads/2025/04/identychnascz-sakavik-2025.docx.pdf

[16] Парламенцкая асамблея Рады Еўропы (ПАРЕ). «Люксембургскія рашэнні: вынікі і перспектывы» (The Luxembourg Solutions: outcomes and perspectives). 6–7 чэрвеня 2024 г. Рада Еўропы.
https://rm.coe.int/prems-149524-bil-3011-outcomes-and-perspectives-txt-web-a4-1-/1680b1b274

культурніцкіх праектаў да сістэмнай стратэгіі ўзмацнення беларускай культуры ў выгнанні і яе міжнароднай інтэграцыі. Сярод ключавых напрамкаў называюцца інвестыцыі ў новае пакаленне беларускіх культурніцкіх менеджараў праз адукацыйныя праграмы, стыпендыі і даследчыя магчымасці; падтрымка перакладаў беларускай літаратуры, навуковых і даследчых прац для пашырэння міжнароднай бачнасці беларускай культуры; стварэнне механізмаў доўгатэрміновага фінансавання беларускай кінавытворчасці, тэатра, літаратуры, спадчыны і іншых культурніцкіх сфер; падтрымка беларускіх культурніцкіх установаў і інстытуцыяў за мяжой; а таксама развіццё культурнай дыпламатыі як інструмента прадстаўлення Беларусі ў краінах-партнёрах.

Асобна падкрэсліваецца неабходнасць палітычнай і сімвалічнай падтрымкі беларускай культуры з боку еўрапейскіх інстытуцый і нацыянальных парламентаў – як спосабу супрацьстаяць манапалізацыі наратываў пра беларускую ідэнтычнасць і стварыць прастору для дыялогу пра сучаснае і будучыню Беларусі. Такім чынам, прапанаваны падыход разглядае культуру не толькі як сферу захавання спадчыны, але і як стратэгічны інструмент умацавання нацыянальнай устойлівасці, міжнароднай прысутнасці і еўрапейскай інтэграцыі Беларусі.

Культура з'яўляецца адным з напрамкаў, па якіх у межах супрацы з Еўрапейскай камісіяй распрацоўваюцца асобныя дарожныя мапы, што прэзентуюцца падчас штогадовай сустрэчы Senior Officials Meeting (SOM). Апошняя з SOM[17] адбылася ў кастрычніку 2025 года. Падрыхтоўка дарожнай мапы па культуры мяркуе комплексную ацэнку патрэбаў сектара, аналіз існуючых магчымасцяў і лакунаў, а таксама фарміраванне больш сістэмнага падыходу да падтрымкі беларускай культуры – над гэтым штогод працуюць прадстаўнікі розных кірункаў культуры. На аснове гэтых дарожных мапаў вызначаюцца прыярытэты далейшага міжнароднага фінансавання і падтрымкі беларускай дэмакратыі, у тым ліку ў культурніцкай сферы.

Найбольш актуальная дарожная мапа прапануе разглядаць беларускую культуру не як сукупнасць асобных праектаў, а як узаемазвязаны сектар, што патрабуе доўгатэрміновага і сістэмнага развіцця, таму прапанова грунтуецца на некалькіх узаемадапаўняльных прынцыпах.

Па-першае, падтрымка павінна быць скіраваная не толькі на асобных творцаў, але і на развіццё ўсёй экасістэмы: інстытуцый, прафесійных сетак, адукацыі, вытворчасці культурніцкага прадукту, міжнароднага супрацоўніцтва і механізмаў фінансавання.

Па-другое, культура разглядаецца як складнік дэмакратычнай устойлівасці Беларусі, таму падтрымка павінна спалучаць захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці з развіццём сучасных культурных практык, міжнароднай мабільнасці і інтэграцыі беларускай культуры ў еўрапейскую культурніцкую прастору.

Па-трэцяе, прапануецца пераходзіць ад кароткатэрміновага праектнага фінансавання да больш устойлівых механізмаў падтрымкі, якія дазволяць беларускім культурніцкім арганізацыям і

[17] European Commission. «EU-Belarus: 4th Senior Officials’ Meeting takes place in Brussels.» 9 October 2025. Directorate-General for Enlargement and Eastern Neighbourhood. https://enlargement.ec.europa.eu/news/eu-belarus-4th-senior-officials-meeting-takes-place-brussels-2025-10-09_en

ініцыятывам планаваць сваю дзейнасць на працяглую перспектыву і нарошчваць інстытуцыйную ўстойлівасць.

То-бок аналіз хіба найбольш рэпрэзентатыўных існуючых міжнародных дакументаў сведчыць, што неабходнасць больш сістэмнага і доўгатэрміновага падыходу да беларускай культуры ўжо сфармуляваная. Як «Люксембургскія рашэнні», так і дарожныя мапы прапануюць комплексныя падыходы да сектара, зрэшты пакуль нерэалізаваныя на практыцы.

Пакуль гэтыя падыходы не склаліся ў адзіную палітычную рамку, якая б разглядала беларускую культуру як адзін з элементаў палітыкі Еўрапейскага Саюза і краін-партнёраў у адносінах да Беларусі. Нягледзячы на прызнанне ролі культуры ў некаторых міжнародных дакументах і рэкамендацыях, яна па-ранейшаму калі і згадваецца – рэдка разглядаецца як самастойны стратэгічны прыярытэт у палітыцы падтрымкі Беларусі.

Як беларускія дэмакратычныя сілы, так і міжнародныя партнёры – у тым ліку Еўрапейскі Саюз і Злучаныя Штаты – традыцыйна канцэнтруюць асноўную ўвагу на палітычных працэсах, правах чалавека, падтрымцы грамадзянскай супольнасці, незалежных медыя і гуманітарных праграмах. Культура ў гэтай сістэме найчасцей застаецца другарадным кірункам, які падтрымліваецца пераважна з меркаванняў салідарнасці, але рэдка разглядаецца як інструмент, здольны ўплываць на доўгатэрміновую траекторыю развіцця Беларусі.

Таму трэці фокус, згаданы тут у кантэксце дарожных мапаў, то-бок устойлівыя механізмы падтрымкі, па выніку не мае шансаў на рэалізацыю.

У сувязі з гэтым дадзены policy paper прапануе перагледзець саму логіку, у межах якой разглядаецца беларуская культура ў міжнароднай палітыцы падтрымкі Беларусі. Ва ўмовах, калі пытанні нацыянальнай ідэнтычнасці, гістарычнай памяці і культурніцкай прасторы набылі выразнае палітычнае і геапалітычнае вымярэнне, культура не можа заставацца выключна гуманітарным або другарадным кірункам падтрымкі. Яна павінна разглядацца як адзін з элементаў доўгатэрміновай стратэгіі ўмацавання дэмакратычнай устойлівасці і захавання беларускай суб'ектнасці.

Аднак без адпаведнага пераасэнсавання ролі культуры ў палітыцы падтрымкі Беларусі ініцыятывы і дакументы, якія прызнаюць важнасць беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці і культурнай спадчыны, рызыкуюць застацца асобнымі рэакцыямі на бягучыя выклікі.

Разам з тым цяперашняя сітуацыя не павінна разглядацца выключна праз прызму крызісу. Апошнія гады прадэманстравалі і высокую здольнасць беларускай культуры да адаптацыі, самаарганізацыі і развіцця ў прынцыпова новых умовах. Нягледзячы на беспрэцэдэнтны ціск, беларускі культурніцкі сектар не толькі працягвае існаваць, але і фармуе новыя інстытуцыі, міжнародныя партнёрствы і мадэлі супрацоўніцтва, якія раней былі практычна адсутныя. Гэта сведчыць пра значны патэнцыял сектара і яго гатоўнасць да доўгатэрміновага развіцця пры наяўнасці адпаведнай падтрымкі.

Адным з найбольш прыкметных вынікаў апошніх гадоў стала самаарганізацыя беларускага культурніцкага сектара. Амаль ва ўсіх асноўных сферах культуры ўзніклі прафесійныя асацыяцыі,

экспертныя сеткі і галіновыя інстытуцыі, якія ўзялі на сябе функцыі развіцця сектара, міжнароднага прадстаўніцтва, адвакацыі, прафесійнай салідарнасці і фарміравання культурнай палітыкі. У тэатральнай сферы дзейнічае Беларускі інстытут тэатра[18], у кіно – Беларуская незалежная кінаакадэмія[19] і Belarusian Filmmakers Network[20], у музыцы – Belarus Outside Sound System (BOSS)[21], развіваюцца сеткі ў сферах літаратуры як Асацыяцыя беларускіх выдаўцоў ці Інстытут беларускай кнігі, гісторыі як Інстытут публічнай гісторыі, спадчыны як Музей вольнай Беларусі[22], Музей імя Луцкевіча ці Скарынаўская бібліятэка ў Лондане[23], выяўленчага мастацтва. Жывучы ў розных краінах, беларускія творцы прадэманстравалі высокую здольнасць захоўваць прафесійныя сувязі, будаваць новыя формы супрацоўніцтва і заставацца часткай агульнай беларускай культурніцкай прасторы.

Да таго ж пошнія даследаванні беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці сведчаць, што, нягледзячы на працяглую палітыку русіфікацыі, значэнне беларускай мовы і культуры як элементаў нацыянальнай ідэнтычнасці працягвае ўзрастаць. Паводле даследавання *Belarusian Identity in 2024*[24], уплыў расейскай культуры ў сферах кіно, літаратуры і музыкі меншы за ўплыў заходняй культурнай прадукцыі, што сведчыць пра істотныя змены ў арыентацыях беларускага грамадства. «Беларусы разглядаюць беларускую мову хутчэй як каштоўнасць, чым як практычную неабходнасць», – кажацца ў даследванні, пацвярджаючы тэзіс аб тым, што мова і культура ў актуальным беларускім кантэксце з’яўляюцца пытаннем ідэнтычнасці.

Усё гэта азначае, што намаганні па падтрымцы беларускай культуры не адбываюцца насуперак грамадскім настроям, а абапіраюцца на ўжо існуючы грамадскі запыт.

Яшчэ адной важнай тэндэнцыяй стаў прыкметны рост цікавасці да беларускай спадчыны, лакальнай гісторыі, традыцыйнай культуры і нацыянальнай аўтэнтычнасці. Досвед эміграцыі і неабходнасць пераасэнсавання ўласнай ідэнтычнасці ўзмацнілі попыт на даследаванне, захаванне і папулярызацыю беларускай спадчыны. Адначасова выявілася маштабная патрэба ў яе сістэмным вывучэнні: значная частка архіўных матэрыялаў, музейных калекцый і даследаванняў застаецца недаступнай для незалежных беларускіх спецыялістаў. У той жа час беларуская культура і гісторыя па-ранейшаму вельмі слаба прадстаўленыя ў заходняй гуманітарнай навуцы і міжнародных культурніцкіх інстытуцыях. Гэта не толькі сведчыць пра існуючы дэфіцыт ведаў, але і адкрывае шырокія магчымасці для даследаванняў, перакладаў, міжнародных партнёрстваў і прадстаўлення беларускага досведу ў еўрапейскім кантэксце.

Такім чынам, сёння беларускую культуру варта разглядаць не толькі як сектар, які патрабуе абароны, але і як сферу са значным патэнцыялам развіцця.

**Варыянты рашэнняў**

---

[18] Беларускі інстытут тэатра. Афіцыйны сайт. https://belarustheatre.org/
[19] Беларуская незалежная кінаакадэмія. Афіцыйны сайт. https://belfilmacademy.com/
[20] Belarusian Filmmakers' Network (BFN). Афіцыйны сайт. https://belfilmnet.work/en/
[21] Belarus Outside Sound System (BOSS). Афіцыйны сайт. https://belarusout.site/
[22] Музей Вольнай Беларусі. Афіцыйны сайт. https://freebelarus.museum/
[23] Беларуская бібліятэка і музей імя Францішка Скарыны. Афіцыйны сайт. https://skaryna.org/be/
[24] *Bikanau P., Nesterovich K. Belarusian Identity in 2024: A Quantitative Study. Friedrich-Ebert-Stiftung, December 2024.* https://library.fes.de/pdf-files/bueros/belarus/21877.pdf

Прапанаваныя рашэнні мяркуюць не варыянты падтрымкі сферы культуры, бо яны ўжо досыць дакладна і ў разбудаваным выглядзе прапісаныя ў дарожных мапах для Еўракамісіі, а логіку «Як думаць пра культуру?». Прапановы дадзенай policy paper кажуць передусім пра парадыгму еўрапейскай палітыкі ў дачыненні да Беларусі.

**Варыянт А. Культура як сфера гуманітарнай падтрымкі (рэактыўны падыход)**

Культура разглядаецца передусім як адзін з сектароў, які пацярпеў ад рэпрэсій і патрабуе дапамогі для захавання жыццяздольнасці. Асноўная мэта – мінімізаваць шкоду, падтрымліваючы асобных творцаў, ініцыятывы і арганізацыі праз праграмы падтрымкі кшталту ArtPower Belarus[25], EED[26], EU4Culture[27] ды іншыя, забяспечваючы іх выжыванне.

**Моцныя бакі**

- не патрабуе перагляду палітыкі;
- лёгка інтэгруецца ў існуючыя праграмы;
- хутка рэагуе на надзвычайныя патрэбы.

**Абмежаванні**

- не ліквідуе прычыны праблем;
- культура застаецца аб'ектам падтрымкі, а не суб'ектам палітыкі;
- слаба ўплывае на доўгатэрміновыя працэсы фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці.

**Варыянт Б. Культура як адзін з сектараў дэмакратычнай падтрымкі**

Беларуская культура разглядаецца як адзін з прыярытэтаў падтрымкі – адпаведна атрымлівае больш увагі і рэсурсаў, уключаецца ў субпраграму Creative Europe, пакуль што бюракратычна амаль недаступную для асобнага фокуса на Беларусі. Палітыка скіраваная на сістэмнае разбудоўванне передусім арганізацый і дэлегаванне ім часткі адказнасці за развіццё сектара, на інтэграцыю беларусаў у праграмы адукацыі, мабільнасці ды культурніцкія інстытуцыі і праграмы ў межах Еўропы і ЗША.

**Моцныя бакі**

- узмацняе інстытуцыйную ўстойлівасць сектара;
- развівае міжнародную інтэграцыю;
- адпавядае ўжо існуючым рэкамендацыям SOM і «Люксембургскіх рашэнняў».

**Абмежаванні**

- не змяняе месца культуры ў агульнай палітыцы падтрымкі Беларусі;

[25] ArtPower Belarus. Захаванне беларускай грамадзянскай прасторы праз культуру і мастацтва. Праграма Беларускай Рады культуры ў партнёрстве з Дацкім інстытутам культуры, фінансуецца Еўрапейскім Саюзам. Афіцыйны сайт. https://byculture.org/artpower_belarus/
[26] European Endowment for Democracy (EED). Афіцыйны сайт. https://www.democracyendowment.eu/
[27] EU4Culture Programme. Афіцыйны сайт праграмы. https://eu4culture.al/

- Creative Europe без асаблівага ўнікальнага падыходу і палітычнай волі не можа стварыць асобную субпраграму для беларусаў, паколькі Беларусь не з'яўляецца краінай-сябрам у платнікам унёскаў у структуры;
- культура працягвае канкурыраваць за ўвагу з іншымі сектарамі;
- яе патэнцыял для нацыянальнай бяспекі і геапалітычнай устойлівасці выкарыстоўваецца толькі часткова.

**Варыянт В. Культура як стратэгічны элемент нацыянальнай ўстойлівасці і еўрапейскай палітыкі адносна Беларусі (рэкамендаваны)**

Прапануецца змяніць саму рамку, у якой культура разглядаецца Еўрапейскім Саюзам, краінамі-партнёрамі і беларускімі дэмакратычнымі сіламі. Культура павінна стаць не адным з кірункаў падтрымкі, а адным з інструментаў доўгатэрміновай палітыкі ў адносінах да Беларусі.

Гэта азначае, што:

- культура разглядаецца як элемент нацыянальнай бяспекі ды частка агульнаеўрапейскай культуры;
- культурніцкая палітыка інтэгруецца ў палітыку падтрымкі Беларусі як прыярытэт і інструмент;
- асноўным аб'ектам падтрымкі становіцца развіццё ўсёй культурніцкай экасістэмы;
- міжнародныя праграмы будуюцца вакол доўгатэрміновых мэтаў, а не асобных конкурсаў;
- распрацоўка палітыкі адбываецца ў партнёрстве паміж Еўрапейскім Саюзам, краінамі-партнёрамі і беларускімі прафесійнымі культурніцкімі інстытуцыямі.

**Моцныя бакі**

- адпавядае сучаснаму разуменню ролі культуры ў супрацьстаянні аўтарытарным рэжымам;
- дазваляе зрабіць падтрымку больш паслядоўнай і прадказальнай;
- павышае эфектыўнасць выкарыстання рэсурсаў праз сістэмнае развіццё сектара;
- фарміруе доўгатэрміновы адказ на палітыку русіфікацыі і асіміляцыі.

**Абмежаванні**

- патрабуе палітычнага прызнання новай ролі культуры;
- патрабуе больш цеснай міжсектаральнай каардынацыі;
- патрабуе больш рэсурсаў;
- вынікі будуць бачныя пераважна ў сярэдне- і доўгатэрміновай перспектыве.

## Рэкамендацыя

Рэкамендуецца перайсці ад палітыкі падтрымкі беларускай культуры як асобнага гуманітарнага і грамадскага сектара да палітыкі яе сістэмнага ўзмацнення як элемента дэмакратычнай устойлівасці, нацыянальнай бяспекі і доўгатэрміновай стратэгіі Еўрапейскага Саюза і краін-партнёраў у адносінах да Беларусі.

Такі падыход патрабуе асобнай стратэгіі на ўзроўні ЕЗ і стварэння ў тым ліку прынцыпова новых фінансавых механізмаў. Першачарговай задачай павінна стаць змена рамкі, у якой культура разглядаецца пры прыняцці палітычных рашэнняў. Гэта азначае пераход ад падтрымкі асобных праектаў да развіцця культурніцкай экасістэмы, здольнай доўгатэрмінова ўмацоўваць беларускую нацыянальную ідэнтычнасць і міжнародную прысутнасць беларускай культуры ды фарміраваць візію мінулага і будучыні праз беларускую культуру перадусім для беларускага грамадства, але таксама для еўрапейскага кантэкста.

**План рэалізацыі**

**1. Замацаваць стратэгічную ролю беларускай культуры ў палітыцы Еўрапейскага Саюза**

Еўрапейская камісія, Еўрапейскі парламент і Рада ЕС прымае сумесны палітычны дакумент (рэзалюцыю, дэкларацыю або іншы палітычны акт), які прызнае беларускую культуру адным з элементаў доўгатэрміновай палітыкі Еўрапейскага Саюза ў адносінах да Беларусі ды з'яўляецца арыентырам для ўнутраных дакументаў гэтых палітычных структур. Прыкладам такога дакумента можа служыць сумесная дэкларацыя «Europe for Culture – Culture for Europe»[28], падпісаная 18 чэрвеня 2026 года, што ўпершыню замацавала стратэгічную ролю культуры ў палітыцы Еўрапейскага Саюза.

Такі дакумент мог бы прызнаць беларускую культуру адным з прыярытэтных элементаў палітыкі падтрымкі Беларусі і замацаваць неабходнасць яе доўгатэрміновага развіцця ў палітыцы ЕС, а таксама стварыць аснову для каардынацыі далейшых дзеянняў паміж інстытутамі ЕС і краінамі-партнёрамі.

**2. Стварыць пастаянную Еўрапейска-беларускую платформу па культуры**

Ствараецца пастаянны механізм супрацоўніцтва паміж Еўрапейскай камісіяй, прызначанымі краінамі-партнёрамі, міжнароднымі арганізацыямі (у тым ліку UNESCO, Creative Europe і Радай Еўропы) і прадстаўнічымі беларускімі культурніцкімі арганізацыямі. Такі механізм можа выкарыстоўвацца для стварэння стратэгіі, каардынацыі дзеянняў і ацэнкі зменаў становішча культуры ды яе ўплыву.

**3. Распрацаваць доўгатэрміновую стратэгію развіцця беларускай культуры**

Еўрапейска-беларуская платформа па культуры распрацоўвае доўгатэрміновую стратэгію развіцця беларускай культуры, не падзяляючы яе на культуру ўнутры Беларусі і культуру ў выгнанні, якая б меркавала сістэматычную працу з сектарам. Стратэгія павінна вызначаць доўгатэрміновыя мэты па ўмацаванні беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці, міжнароднай прысутнасці беларускай

---

[28] Еўрапейскі парламент. *«Europe for Culture, Culture for Europe»: culture at the heart of EU policy*. Прэс-рэліз. 18 чэрвеня 2026 г. https://www.europarl.europa.eu/news/en/press-room/20260617IPR45606/europe-for-culture-culture-for-europe-culture-at-the-heart-of-eu-policy

культуры, развіцці яе інстытуцыйнай устойлівасці і разглядаць культуру як інструмент ва ўмовах геапалітычнай канкурэнцыі за культурніцкую і каштоўнасную прастору краіны.

**4. Інтэграваць культуру ў палітыкі ў сферы адукацыі і медыя**

Палітыка ў сферы культуры павінна распрацоўвацца ў цеснай сувязі з палітыкамі ў сферы адукацыі і незалежных медыя. Пры распрацоўцы стратэгіі неабходна ўлічваць іх узаемны ўплыў на фарміраванне нацыянальнай ідэнтычнасці, гістарычнай памяці і дэмакратычных каштоўнасцяў. Каардынацыя гэтых напрамкаў дазволіць павысіць эфектыўнасць гэтага кірунка і сфармаваць больш паслядоўны доўгатэрміновы адказ на выклікі.

**5. Вызначыць краіны-партнёры для доўгатэрміновага развіцця асобных сектараў беларускай культуры**

Еўрапейскай камісіі сумесна з краінамі-партнёрамі варта сфарміраваць сістэму доўгатэрміновага куратарства, у межах якой асобныя дзяржавы бяруць на сябе вядучую ролю ў развіцці пэўных сектараў беларускай культуры або стратэгічных напрамкаў. Гэта дазволіць назапашваць экспертызу, будаваць партнёрствы паміж беларускімі і нацыянальнымі інстытуцыямі, забяспечыць пераемнасць падтрымкі і пазбегнуць фрагментацыі міжнародных намаганняў.

***

Беларуская культура сёння знаходзіцца ў выключнай гістарычнай сітуацыі. З аднаго боку, яна сутыкаецца з беспрэцэдэнтнымі пагрозамі, звязанымі з рэпрэсіямі і ўзмацненнем расійскага ўплыву. З другога – дэманструе высокую здольнасць да самаарганізацыі, міжнароднага супрацоўніцтва і развіцця. Ад таго, ці будзе міжнародная палітыка ўспрымаць культуру як стратэгічны рэсурс, залежыць не толькі будучыня аднаго з сектароў, але і здольнасць Беларусі захаваць уласную суб'ектнасць у доўгатэрміновай перспектыве.